**А.І. КАЖЭКІНА**
Рэспубліка Беларусь, Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава

# ЧАСОПІС "ПАЧАТКОВАЯ ШКОЛА" ЯК ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНЫ РЭСУРС ДЛЯ СУЧАСНАГА НАСТАЎНІКА

**Уводзіны.** Сучасны этап развіцця беларускай адукацыі, вызначаны Адукацыйным стандартам пачатковай адукацыі (зацверджаны Пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 28.11.2025 № 199), прад'яўляе высокія патрабаванні да прафесійнай кампетэнтнасці настаўніка пачатковай школы. Стандарт актуалізуе такія падыходы, як аксіялагічны, сістэмна-дзейнасны, культуралагічны, асобасна-арыентаваны, што патрабуе ад настаўніка пастаяннага абнаўлення метадычнага інструментарыю і асэнсавання новых педагагічных сродкаў [1, с. 5]. Ва ўмовах дынамічнага інфармацыйна-адукацыйнага асяроддзя настаўнік мае патрэбу ў надзейных, сістэматызаваных і навукова абгрунтаваных метадычных крыніцах. Адной з такіх крыніц аб’ектыўна можна назваць часопіс «Пачатковая школа». Актуальнасць абранай тэмы абгрунтоўваецца роляй метадычнага выдання ў забеспячэнні педагагічнага супольніцтва новымі ідэямі, у распаўсюджванні перадавога вопыту, знаёмстве з інавацыйнымі праектамі, у адаптацыі будучых настаўнікаў да патрабаванняў сучаснай адукацыі.

*Мэта даследавання* – комплексны аналіз зместу і метадычнага патэнцыялу часопіса «Пачатковая школа» ў кантэксце прафесійнай падрыхтоўкі настаўніка, спроба ацэнкі ўзроўню запатрабаванасці часопіса ў педагагічнай супольнасці. Для дасягнення пастаўленай мэты былі сфармуляваны наступныя *задачы:*

– прааналізаваць змест, структуру і асноўныя рубрыкі часопіса «Пачатковая школа» на прадмет іх адпаведнасці актуальным накірункам мадэрнізацыі пачатковай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь;

– правесці анкетаванне сярод будучых настаўнікаў пачатковай школы для выяўлення ўзроўню іх дасведчанасці пра выданне, характар выкарыстання ў прафесійнай дзейнасці.

– распрацаваць інфарматыўны мультымедыйны сродак для азнаямлення з часопісам «Пачатковая школа».

**Асноўная частка.** Для дасягнення сфармуляванай мэты выкарыстоўваліся наступныя метады: тэарэтычны аналіз нарматыўных дакументаў са сферы адукацыі, педагагічнай, метадычнай літаратуры, зместу нумароў часопіса «Пачатковая школа» за апошнія гады; анкетаванне; метады колькаснай і якаснай апрацоўкі інфармацыі.

Прафесійная перыёдыка – гэта істотны кампанент у сістэме падрыхтоўкі маладога педагога. Сістэматычнае азнаямленне з перыядычнымі выданнямі спрыяе павышэнню кампетэнтнасці спецыяліста, яго навукова-метадычнай інфармаванасці, выступае

актуальнай крыніцай фарміравання інфармацыйнай культуры. Навуковы-метадычны часопіс «Пачатковая школа» выходзіць са студзеня 1992 года, уключаны ў серыю «У дапамогу педагогу». Выданне аказвае навукова-інфармацыйную і арганізацыйна-метадычную дапамогу настаўнікам пачатковай школы, намеснікам дырэктара, выхавальнікам груп падоўжанага дня. Артыкулы ў часопісе публікуюцца на беларускай і рускай мовах.

Як указана на афіцыйным сайце часопіса, асноўны напрамак дзейнасці выдавецтва – асвятленне актуальных праблем тэорыі і практыкі пачатковага навучання і папулярызацыя перадавога педагагічнага вопыту [2].

Навукова-метадычнае суправаджанне выдання ўлічвае вопыт педагога, яго магчымасці і запыты, дэталізуе методыку рэалізацыі атрыманых ведаў у рэальнай педагагічнай практыцы. Часопіс «Пачатковая школа» трансфармуе гэтыя патрабаванні праз змест, насычаны верагодным, навукова выверанным і цікавым метадычным, дыдактычным і інфармацыйным матэрыялам.

Вядучымі рубрыкамі часопіса з’яўляюцца: «Метадычная майстэрня», «Актуальнае інтэрв’ю», «Кансультуюць спецыялісты», «Выхаваўчая гадзіна», «Навуковы партал», «Актуальна» і г.д. Усе рубрыкі выдання аб’яднаныя тэматычна ў сэнсавыя блокі ў залежнасці ад іх зместу і дыдактычнага напаўнення. Рубрыкі часопіса – гэта своеасаблівыя метадычныя гіды, якія дапамагаюць чытачу эфектыўна знаходзіць патэбныя матэрыялы, натхняюць на маленькія педагагічныя «адкрыцці». Прызначэнне рубрык – структураваць інфармацыю, што робіць выданне запатрабаваным і зручным для карыстальніка, аблягчае пошукі па канкрэтнай тэме.

Разам з тым стабільны набор рубрык сведчыць пра сталыя традыцыі рэдакцыі ў адлюстраванні праблем айчыннай педагогікі, а новыя – адлюстроўваюць актуальныя накірункі і пытанні сучаснай школы. Спалучэнне традыцыйных і найноўшых рубрык гаворыць пра тое, што часопіс знаходзіцца у метадычным трэндзе сённяшніх праблем адукацыі. Можна сцвярджаць, што прапанаваныя рубрыкі аўтарытэтнага часопіса – свайго роду метадычныя навігатары, якія дапамагаюць арыентавацца ў надрукаваных дыдактычных матэрыялах.

Так, метадычна-выхаваўчы блок прадстаўлены рубрыкамі, якія змяшчаюць распрацаваныя матэрыялы для ўрокаў (планы-канспекты, дыдактычныя гульні, віктарыны, крыжаванкі, падарожжы і інш.), класных і інфармацыйных гадзін, мерапрыемствы для шостага школьнага дня і групы падоўжанага дня, сцэнарыі для школьнага лагера, канспекты для правядзення майстар-класаў, круглых сталоў, выхаваўчыя акцыі патрыятычна-грамадскага напрамку і г.д. Гэта найбольш аб’ёмны блок, які з’яўляецца «сарцавінай» выдання. Рубрыкі («Метадычная майстэрня», «Выхаваўчая гадзіна», «Класная гадзіна», «Інфармацыйная гадзіна», «Шосты школьны дзень», «Група падоўжанага дня», «Школьны лагер», «Наша чытанка», «Сваімі

рукамі», «Школьны музей») вызначаюць сутнасць і запатрабаванасць метадычнага часопіса ў прафесійнай супольнасці.

Навуковы раздзел прадстаўлены рубрыкамі «Навуковы партал», «Актуальна», «Вопыт калег». Да гэтага блока прымыкаюць матэрыялы модуля «Кансультуюць спецыялісты» і «Інклюзіўная адукацыя», якія раскрываюць прызначэнне прынцыпу даступнасці, які рэалізуе права на адукацыю і сацыяльную інтэграцыю навучэнцаў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця. Названыя рубрыкі выконваюць функцыю дыялога з чытачамі, гэта дапамагае ствараць актуальны кантэнт часопіса і фарміруе запыты настаўнікаў, што ператварае часопіс у актуальную дыялогавую пляцоўку для абмену меркаваннямі і метадычным вопытам.

Інфармацыйны блок з’яўляецца адной з крыніц ведаў пра сутнасць сучасных з’яў у сферы адукацыі і прадстаўлены рубрыкамі «Новае ў змесце пачатковай адукацыі», «Пасля ўрокаў», «Крыніца прафесійных знаходак». Назвы і змест публікацый адлюстроўваюць рэдакцыйную палітыку, прыярытэты і запыты мэтавай настаўніцкай аўдыторыі.

Камунікатыўны блок адметны тым, што дазваляе пазнаёміцца з выбітнымі асобамі сучаснай педагогікі. Кожны нумар часопіса адкрывае рубрыка «Актуальнае інтэрв’ю». Гэта цікавы дыялог пра высокую місію настаўніка ў сучасным свеце, у якім педагог выступае не толькі крыніцай ведаў, але і «архітэктарам», арганізатарам адукацыйнай прасторы. Ключавыя публікацыі прысвечаны ўкараненню лічбавых тэхналогій, захаванню цікавасці да прадметаў праз фарміраванне маральных каштоўнасцей і ўменняў функцыянальнай пісьменнасці.

Кожнае выданне часопіса мае каляровыя ўкладкі (2 плакаты фармату А2) – наглядны дэманстрацыйны матэрыял і мультымедыйны дадатак, у які ўваходзіць сучасная нагляднасць да ўрокаў, а таксама педагагічная скарбонка заданняў па розных прадметах. У дадатку змешчаны дэманстрацыйны і раздатачны матэрыял, аўдыя- і відэаінфармацыя, распрацоўкі канспектаў урокаў, факультатыўных заняткаў, памяткі, інтэрактыўныя гульні і мультымедыйныя прэзентацыі.

На вокладках часопіса прапануецца рэкламная інфармацыя ад выдавецтва «Адукацыя і выхаванне» адносна вучэбнай і метадычнай літаратуры, якая можа спатрэбіцца настаўніку пачатковай школы. Гэта з’яўляецца адным з элементаў інфармацыйнага суправаджэння чытачоў.

Такім чынам, некаторыя рубрыкі маюць пастаянны характар і захоўваюцца на працягу ўсяго выдання (напрыклад, «Метадычная майстэрня» і «Актуальнае інтэрв’ю»). Некаторыя рубрыкі маюць сезонную скіраванасць – «Летні лагер», «Выніковы кантроль», «Беларусь турыстычная». Таксама маюцца рубрыкі, якія адлюстроўваюць актуальныя грамадскія мерапрыемствы і падзеі – «Год міру і стварэння», «Пяцігодка якасці», «80 гадоў Вялікай Перамогі». Нельга забыць і пра дадатак, які з’яўляецца ў кожным нумары часопіса, – «У дапамогу намесніку дырэктара».

Такім чынам, часопіс «Пачатковая школа» мае добра структураваную і стабільную мадэль зместу, якая цалкам адпавядае патрабаванням сучаснага

настаўніка. Аснову выдання складаюць разнастайныя рубрыкі, што забяспечваюць комплексны падыход да асвятлення прафесійных пытанняў. Галоўнымі перавагамі выдання з’яўляюцца яго практыкаарыентаванасць, наяўнасць цікавых метадычных распрацовак, асвятленне актуальных навуковых меркаванняў і інтэрв’ю з экспертамі. Мультымедыйныя дадаткі і каляровыя ўкладкі істотна павялічваюць карыснасць і запатрабаванасць матэрыялаў. Цэласна часопіс выконвае ролю надзейнай і шматграннай прафесійнай апоры для педагога, забяспечваючы яго як тэарэтычнымі ведамі, так і практычнымі метадычнымі рэсурсамі.

На наступным этапе даследавання было арганізавана анкетаванне студэнтаў першага курса спецыяльнасці «Пачатковая адукацыя». Анкетаванне было накіравана на выяўленне дасведчанасці і частотнасці выкарыстання часопіса «Пачатковая школа» студэнтамі.

У анкетаванні ўдзельнічалі 22 чалавекі. Вынікі наступныя: на пытанне «Ці ведаеце вы пра часопіс «Пачатковая школа«?», станоўча адказалі 82% апытаных (18 чалавек). На пытанне «Як часта вы карыстаецеся часопісам «Пачатковая школа«?» 67% выбралі адказ «Вельмі часта», 29% – «Рэдка», 4% – «Дастаткова рэдка». Найбольш карыснымі па выніках анкетавання з’яўляюцца рубрыкі «Метадычная майстэрня», «Выхаваўчая гадзіна», «Вопыт калег».

З мэтай рэкламавання ў рамках даследавання быў распрацаваны інтэрактыўны плакат «Часопіс «Пачатковая школа» – інфармацыйна-метадычны рэсурс сучаснага настаўніка", з якім студэнтам было прапанавана азнаёміцца (Мал).

Лічым, што пастаянны зварот будучых настаўнікаў да сучасных педагагічных часопісаў фарміруе прафесійнае ўменне комплексна ацэньваць навукова-метадычныя выданні, улічваючы сістэму паказчыкаў, фактаў, аргументаў, праводзіць іх параўнальны аналіз, бачыць педагагічную з’яву цэласна, дапамагае аб’ектыўна аналізаваць уласныя ўрокі і ўрокі калег.




**Малюнак – Інтэрактыўны плакат «Часопіс «Пачатковая школа» – інфармацыйна-метадычны рэсурс сучаснага настаўніка.»**

**Заключэнне**. Такім чынам, часопіс «Пачатковая школа»:

– мае стабільную і комплексную структуру зместу, якая цалкам адпавядае актуальным запатрабаванням сучаснай адукацыі. Рубрыкі выдання забяспечваюць педагога як тэарэтычнымі ведамі, так і гатовымі практычнымі метадычнымі матэрыяламі;

– выданне з'яўляецца каштоўным практыкаарыентаваным рэсурсам. Асаблівасць часопіса – наяўнасць метадычных распрацовак, дыдактычных матэрыялаў і мультымедыйных дадаткаў, што істотна аблягчаюць штодзённую працу настаўніка і спрыяюць рэалізацыі кампетэнтнаснага падыходу ў навучанні;

– распрацаваны ў рамках даследавання інтэрактыўны плакат павышае інфармаванасць і зацікаўленасць будучых настаўнікаў у матэрыялах часопіса, што пацвярджаецца станоўчымі вынікамі пасляэксперыментальнага апытвання і падкрэслівае практычную значнасць выдання.

Спіс выкарыстаных крыніц:

1. Образовательный стандарт начального образования: утв. Постановлением Министерства образования Республики Беларусь от 28.11.2025 № 199: [сайт]. – URL: https://adu.by/ru/ (дата звароту: 01.02.2026).
2. Выдавецтва «Адукацыя і выхаванне»: [сайт]. – URL: http://www//aiv.by/ (дата звароту: 01.02.2026).

**П.А. КОЗЛОВА**
Республика Беларусь, ВГУ имени П.М. Машерова

## ЭФФЕКТИВНЫЕ МЕТОДЫ И ПРИЕМЫ ФОРМИРОВАНИЯ НАВЫКА ЧТЕНИЯ УЧАЩИХСЯ НАЧАЛЬНЫХ КЛАССОВ

**Введение.** Овладение учащимися начальных классов навыком чтения является важнейшей проблемной задачей, стоящей перед современными педагогами начальной школы. Сегодня данный навык становится одним из ключевых факторов успешного обучения в современной школе, а его несформированность преследует ощутимые и заметные трудности в освоении различных предметов учебной программы в начальных классах, существенно понижает учебную мотивацию у учащихся и ограничивает их когнитивные возможности, направленные, в свою очередь, на усвоение и обработку необходимой учебной информации.

Вопрос проблематики формирования навыка чтения у учащихся начальных классов приоритетен в настоящее время еще и потому, что у весомой части этой группы учеников наблюдается заметное отставание от принятой в школе нормы усвоения разных компонентов данного навыка: слогового анализа, артикуляции, зрительного восприятия, скорости (беглости) чтения, правильного понимания прочитанного текста и пр. Поэтому разработка и внедрение результативных и доказавших свою функциональность на практике психолого-педагогических методов и приемов формиро-